**Маргарыта Шабар**

## Вечнае

Не было дзяцей у старога Данілы, ды толькі невядома адкуль праз шмат гадоў пасля яго на зямлі з'явіўся Бандарук. Адкуль пайшло яго прозвішча, таксама невядома, мо і быў ён нейкім родзічам бондару Данілу, а мо і не быў – цяпер ужо не разбярэшся. Было яму ўсяго 20 гадоў, з якіх 8 ён працаваў кафляром. Ужо з дзяцінства было зразумела, што дзіця таленавітае і, быццам, Богам блаславёнае. Любая праца рукамі, ці то зайграць на музычным інструменце, ці то змайстраваць штосьці, давалася яму лёгка, і вынік заўсёды быў выдатным. Ці пазайздросціў хто яго "залатым ручкам", ці яшчэ па якой прычыне, ды толькі працаваў у свае 20 хлапец ужо не на сябе і сям'ю…

"Стройся на сняданак!"

Бандарук ішоў наперадзе калоны, як самы "небяспечны" катаржнік.

У руках талерка з астылай кашай, якая некаторым толькі сцішала голад. Яму ж шмат і не трэба было. Задавальняўся тым, што давалі. Ды ўвогуле скардзіцца не меў моды. За ўсё дзякаваў Богу. Устане ранічкай раней за сонейка, зробіць сабе гарачую каву, возьме ў рукі Біблію і выйдзе ў надворак: чытае, моліцца і дзякуе Богу за новы дзень. Такі быў наш Бандарук!

У першай палове дня вучыўся з іншымі катаржнікамі працаваць за дрэваапрацоўчым станком. Якая там вучоба… Тэхніку бяспекі праслухаў – і за станок, практычны занятак. І тут яго залатыя рукі прыгадзіліся. Усё, да чаго дакранецца, у мастацкі твор ператвараецца. Дошкі адпаліроўваў да бляску, узоры выразаў выкручастыя, якія вока радавалі сваёй акуратнасцю і ідэальнай тэхнікай. А ўвечары працаваў з гумай. Праца не мудрагелістая: бяры ды выцягвай дрот з шын. Так і жыў малады хлапец.

Аднойчы, у адзін з такіх звычайных дзён, падобных адзін на другі, як дзве кроплі вады, адбылося штосьці незвычайнае. Далі заданне Бандаруку пафарбаваць у калідоры (праз які вадзілі на абед катаржнікаў) сцены. Як заўсёды, памаліўшыся і папрасіўшы ў Бога блаславення на добрую працу, Бандарук узяўся за пэндзаль. Фарбы самі прасіліся на прыладу. Перад вачамі паўстаў малюнак, што часта бачыў у сваіх мроях хлапец – і ён узяўся за працу. Намаляваў возера на лясным узлессі, вакол якога павіслі над вадой галіны ўзбярэжных дрэў; прагаліну, усыпаную рознакаляровымі кветкамі шматлікіх сартоў; а пасярод прагаліны – анёльчыка, падобнага на трохгадовую дзяўчынку. Яна сыпала зярняткі са свайго маленькага кошыка і карміла качанят, што мітусіліся пад яе босымі ножкамі.

Паглядзеў Бандарук на свой твор і ўсміхнуўся працы гэтай. І сляза ў гаротніка пакацілася: ўзгадаў сваю сям'ю, якую так любіў і імкнуўся абараніць. Апошнім штрыхом ён намаляваў над дрэўцамі вялікае сонейка, праменні якога асвяцілі ўсё навокал. Заблішчэла вада пад яго праменнямі, параскрываліся насустрач яму бутоны кветак, німб над галавой анёльчыка заззяў, і ўсё памяшканне залілося цёплымі праменнямі намаляванага сонейка. Так Бандарук перадаў вобраз Бога, які кіраваў яго сэрцам.

Хлапец скончыў сваю працу і "здаў" на ацэнку кіраўніцтву. Сэрцы ўсіх, хто глядзеў, расчуліліся, і з кожнай пары вачэй пацяклі слёзы, і шырокія ўсмешкі расцягнуліся па тварах. Памякчэлі адразу і канваіры і катаржнікі. "Як прыгожа!" – злятала з грубых мужчынскіх вуснаў ад захаплення. Праходзячы па гэтым калідоры, кожны ўзгадваў пра тое, што больш за ўсё любіў, што недастаткова шанаваў у жыцці і па гэтай прычыне згубіў. І кожны плакаў, каючыся за сваю непавагу, чэрствасць, няўдзячнасць, і разам са слязьмі сыходзілі іх душэўны боль і туга, а на іх месца прыходзіла…

Любоў!

Так, любоў! Вечнае і светлае пачуццё, якое кіруе гэтым светам ад пачатку яго. Любоў да жыцця, да сям'і, да Бога. Любоў вечная і бясконцая як сам свет. А разам з ёю шчасце і супакой напоўнілі сэрцы людзей.

… Бандарук выйшаў на волю, пакінуўшы пасля сябе неймаверны след.

Так бывае, калі чалавек вядомы не ганарлівасцю сваёй, а любоўю, шчырасцю і Божым Словам.